УДК [323.285:371.671:94(476)]"20"

*Ірына РАМАНАВА*

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ БАЛЬШАВІЦКАГА ТЭРОРУ Ў ШКОЛЬНЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ КУРСАХ

У статті зазначено, що поєднання радянської схеми викладання історії з деякими переписами «старих» тем і невеликим додаванням нових є характерним для підручників Білорусі в XXI ст. Стаття складається з двох частин. Перша частина присвячена інтерпретації періоду 1930-х років у шкільному підручнику для 10 класів (Я. К. Новик, «Історія білорусів», 1917–1945 рр., «Вуч, Дапам, 10 клас», Мінськ: «Народна асвета», 2012. 182 с.). Друга частина окреслює основні ідеї автора, і її можна розглядати як альтернативний підручник. Основні тези: треба не лише змінити структуру подання матеріалу підручника (соціально-політичне життя, соціально-економічний розвиток, культура), але й його концепцію. Ми повинні відмовитися від тоталітарної моделі вивчення радянського суспільства. В епоху «всезнавця» Google і великої кількості конфліктних джерел завданням шкільного курсу має стати формування навичок критичного мислення. У статті розкрито, як можна спробувати вирішити ці проблеми, залучивши певні теми та матеріали дошкільних курсів.

*Ключові слова:* Білорусь, шкільні підручники, вітчизняна історія, викладання матеріалу, нові концепції.

Бясконцае прайграванне савецкай схемы з некаторым перапісваннем «старых» тэм і невялікім украпленнем новых – вось што характарызуе нашыя падручнікі па XX стагоддзі. Натуральна, варта спыніцца на змесце падручнікаў, але, падкрэслю, неактуальнай на сённяшні дзень з'яўляецца і сама канцэпцыя падачы матэрыялу.

У дадзеным артыкуле я спынюся, найперш, на 1930-х гадах. За аснову вазьмудзейнічаючы школьны падручнік Я. К. Новіка «Гісторыя Беларусі, 1917–1945»[1], пасля паспрабую акрэсліць асноўныя меркаванні наконт таго, як мог бы выглядаць альтэрнатыўны падручнік.

1920–1930-м гадам ва ўзгаданым падручніку прысвечаны другі раздзел («Беларусь ва ўмовах станаўлення савецкага сацыялістычнага грамадства. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы»), нас цікавяць параграфы 8–17.

Літаральна першым сказам дадзенага раздзелу задаецца фрэйм і вектар: «1921–1939 гг. – перыяд ажыццяўлення ў Беларускай ССР новай эканамічнай палітыкі і будаўніцтва савецкага сацыялістычнага грамадства». Такім чынам, размова будзе весціся ў рамках парадыгмы «будаўніцтва савецкага сацыялістычнага грамадства»

[1] *Новік Я. К.* Гісторыя Беларусі, 1917–1945: вучэб. дапам. для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / Я. К. Новік. – Мінск: «Народная асвета», 2012. – 182 с.

(с. 46)[2], бо пра нэп тут жа напісана коратка і зразумела – гэта «тактычны манеўр Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы ва ўмовах пасляваеннай разрухі, а не змена стратэгічнага курсу» (с. 47). Пры чым, для выступаючых супраць «тактычнага манеўру» гэта было «ідэалагічным прыкрыццём барацьбы за ўладу, якая доўжылася на працягу двух наступных дзесяцігоддзяў».

Пры чытанні падручніка нельга пазбавіцца ад уражання, што ёсць нейкі абсалют – Камуністычная партыя і Савецкая дзяржава, якія ведаюць, як трэба, усе, хто супраць, маюць толькі карысныя мэты. Пры чым, ніякіх прозвішчаў, фактаў! Змагаюцца сілы Дабра і Зла. Далей ідзе некаторая канкрэтызацыя – сілы Дабра прадстаўлены Сталіным, Зла, найперш, – Троцкім, які прапаноўваў абкласці сялян «індустрыяльнай данінай» (с. 47). Палітычная лінія прыхільнікаў Сталіна (як сказана ў падручніку «большасці кіраўнікоў ЦК ВКП(б) і СНК СССР»(!)) асноўвалася на тым, што «індустрыя павінна базіравацца на паступовым пад’ёме матэрыяльнага і культурнага ўзроўню працоўных горада і вёскі» (с. 47)[3]. Але ў наступным абзацы размовы пра гэта ўжо няма, ёсць – пра неабходнасць дагнаць капіталістычныя краіны і пра поспехі, якія былі дасягнуты.

У раздзеле аб Культурнай рэвалюцыі, сцвярджаецца: «Усе здабыткі культуры і сусветнай цывілізацыі станавіліся даступнымі для чалавека працы» (с. 48). Гучыць як лозунг. І не было ў СССР ні цэнзуры, ні ідэалагічнага дыктату, ні барацьбы з іншадумствам, ні жалезнай заслоны і г. д.

На ст. 48 пасля заявы, што «да канца 30-х гадоў у СССР было створана сацыялістычнае грамадства», мы, урэшце, можам даведацца што гэта такое, «сацыялістычнае грамадства»,сярод сямі пунктаў вызначэння наступныя: аднапартыйная сістэма, усеўладдзе партыйна-дзяржаўнай наменклатуры і абмежаванне дэмакратычных пачаткаў у жыцці грамадства. Вось так вось! З гэтым паспрачацца нельга, усё гэта да канца 1930-х гадоў ужо мела месца, а значыць, зыходзячы з такога вызначэння, «сацыялістычнае грамадства было створана».

[2] У падручніку па Сусветнай гісторыі сказана іншае: «В СССР был построен “государственный социализм” і далей: “Государственный социализм” советского типа явился иной альтернативной капитализму моделью индустриального развития общества» (*Космач Г. А.* Всемирная история Новейшего времени: 1918–1945: учеб. пособие для 10 кл. учреждений общ. сред. образования с русским языком обучения / Г. А. Космач, В. С. Кошалев, М. А. Краснова. – Минск: Народная асвета, 2012. – С. 84.

[3] Параўнаем з падручнікам па Сусветнай гісторыі: «Советское партийное руководство во главе с И. В. Сталиным, отказавшись от нэпа, перешло к политике индустриализации, а затем и к коллективизации страны. Индустриализация требовала огромных средств и накоплений. Сторонники нэпа в руководстве партии и государства предлагали делать необходимые накопления шаг за шагом, медленно и постепенно строить социализм, используя прежде всего экономические рычаги. Противники нэпа во главе со Сталиным, обвиняя своих оппонентов в защите частной собственности и буржуазных элементов, утверждали, что нэп не может дать средств, необходимых для ускоренной индустриализации. Победила точка зрения Сталина, который поставил задачу в короткий срок создать мощную индустриальную базу, опираясь на собственные силы. В данных исторических условиях эту задачу можно было решить только за счет усиления давления на крестьянство. В ходе сплошной коллективизации сельского хозяйства, начавшейся в конце 1929 г., был создан механизм перераспределения средств на нужды индустриализации» (*Космач Г. А.* Всемирная история Новейшего времени… – С. 91–92).

У наступным абзацы пералічваюцца дэфармацыі «першага ў свеце сацыялістычнага грамадства» і тут sic! «абмежаванне дэмакратычных пачаткаў у жыцці грамадства». Толькі што гэта было прыкметай сацыялістычнага грамадства, а зараз, аказваецца, гэта дэфармацыя. Затое далей ідзе тлумачэнне, чаму мелі месца гэтыя дэфармацыі (у вельмі апраўдальным ключы) (с. 48).

Рубрыка «Ваша меркаванне» ненавязчыва падводзіць вучняў да таго, што ахвяры ў 1930-я гады мелі месца, але яны былі апраўданыя. І апраўданнем гэтым ахвярам з'яўляецца перамога ў Вялікай Айчыннай вайне.

У параграфе 10 «Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1920-я гады», як у старыя часы, размова ідзе аб дзейнасці саветаў, прафсаюзаў, камсамола. Аб стварэнні СССР напісана: «У выніку ўсебаковага супрацоўніцтва да сярэдзіны 1922 г. усе савецкія рэспублікі прыйшлі да ідэі дзяржаўнага саюза паміж імі», рэспублікі «частку паўнамоцтваў добраахвотна перадавалі цэнтральным органам улады» (с. 57)[4]. Ну і, натуральна, ад уваходжання на такіх умовах – суцэльная карысць.А пасля гэтага рубрыка «Ваша меркаванне», зноў жа, «як бы няўзнак» пытаецца ў вучняў: «Ці згодны вы з тым, што ўтварэнне СССР адпавядала жыццёвым інтарэсам Савецкай Беларусі?».

У параграфе 11 «Беларусізацыя» пры апісанні палітыкі карэнізацыі маецца пасаж, што «некаторыя сіяністскія арганізацыі» (што гэта за арганізацыі?) скардзіліся на выкідванне яўрэяў з устаноў. Аўтар падручніка адказвае ім: «у канцы 1920-х гг. колькасць яўрэяў на кіруючых пасадах у некалькі разоў перавышала іх удзельную вагу ў складзе насельніцтва БССР» (с. 65). Па-першае, адно другому не пярэчыць. А па-другое, ёсць у гэтым некі антысеміцкі пасыл (мала выкідвалі? ці што?). Яўрэі, як і беларусы, былі мясцовымі, карэннымі, яны складалі значна большую частку гаражан, чым беларусы і мелі лепшую адукацыю, то на дадзеным гістарычным этапе заканамерна, што ім прасцей было займаць якія б то ні было пасады, чым беларускам-сялянам.

У параграфе 13 «Правядзенне індустыялізацыі ў БССР» пішацца пра формы перапампоўвання сродкаў на патрэбы індустрыялізацыі (с. 73), літаральна некалькі параграфаў назад ў гэтым быў выкрыты Троцкі і яму супрацьпастаўлены Сталін, які быў катэгарычна супраць (с. 47), а вось як адбыліся такія перамены, напэўна, разумны вучань павінен сам дадумацца, супаставіўшы матэрыял з тым, што прыводзіцца ў рамках падручніка па сусветна гісторыі, ці ў Вікіпедыі пачытаць[5].

[4] Параўнаем з падручнікам па Сусветнай гісторыі: «Вопреки идее Ленина СССР по своей сути являлся централизованным государством. Первые союзные республики находились под полным контролем большевиков и РСФСР» (*Космач Г. А.* Всемирная история Новейшего времени… – С. 88).

[5] Параўнаем з падручнікам па Сусветнай гісторыі: «Советское партийное руководство во главе с И. В. Сталиным, отказавшись от нэпа, перешло к политике индустриализации, а затем и к коллективизации страны» (с. 91). «Индустриализация требовала огромных средств и накоплений. Сторонники нэпа в руководстве партии и государства предлагали делать необходимые накопления шаг за шагом, медленно и постепенно строить социализм, используя прежде всего экономические рычаги. Противники нэпа во главе со Сталиным, обвиняя своих оппонентов в защите частной собственности и буржуазных элементов, утверждали, что нэп не может дать средств, необходимых для ускоренной индустриализации. Победила точка зрения Сталина, который поставил задачу в короткий срок создать мощную индустриальную базу, опираясь на собственные силы. В данных исторических условиях эту задачу можно было решить только за счет усиления давления на крестьянство. В ходе сплошной коллективизации сельского хозяйства, начавшейся

Рубрыка «Ваша меркаванне» зноў мае выхаваўчы эфект, вучням належыць паразважацьаб ролі сацспаборніцтва і энтузіазму ў гады індустрыялізацыі.

Параграф 14 «Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР» пачынаецца з пераканання чытачоў у неабходнасці яе правядзення, больш за тое, у яе гістарычнай абумоўленасці: «Пры распрацоўцы і правядзенні палітыкі калектывізацыі ўлічваліся калектывісцкія традыцыі славянскай (!) вёскі – сялянская абшчына, калектыўная праца на будоўлі дарог і мастоў, падчас дапамогі людзям, якія трапілі ў бяду («талака»), а таксама вопыт развіцця кааперацыі ў дарэвалюцыйнай Расіі» (с. 76).

«Было зроблена нямала, каб сяляне добраахвотна ўступалі ў калгасы. Аднак прынцып добраахвотнасці пры арганізацыі калгасаў не заўсёды забяспечваўся» (с. 76). Далей ідзе традыцыйны савецкі наратыў, аб тым, што бяднейшае сялянства было за калгасы, заможнае – супраць, а сераднякі вагаліся. Вельмі адназначна трактуецца тэрмін «кулак», быццам бы сапраўды была такая аб’ектыўна існуючая катэгорыя насельніцтва, альбо пры навешванні ярлыка «кулак» улады кіраваліся нейкімі аб’ектыўнымі прыкметамі (с. 77). Больш за тое, дакумент прыведзены ў канцы параграфа «Аб прыкметах кулацкіх гаспадарак», з пастановы СНК СССР ад 21 мая 1929 г., павінен пацвердзіць вышэйсказанае. Атрымліваецца – усё па закону! За выключэннем асобных перагібаў…

Пераход да суцэльнай калектывізацыі ад папярэдняга перыяду адрозніваўся тым, што «сялян ***часта*** сталі прымушаць запісвацца ў калгасы». Нельга думаць, што нехта сёння ўсур’ёз можа верыць такім змякчэнням аўтара. Сярод формаў супраціву сялянства калектывізацыі – толькі масавае забойства сялянамі сваёй жывёлы. Аўтар адзначае, што пагалоўе жывёлы моцна скарацілася.

І далей: «нельга называць усіх багатых сялян людзьмі, якіх савецкая ўлада незаслужана карала, крыўдзіла. Толькі са студзеня да красавіка 1930 г. было зафіксавана 519 антысавецкіх кулацкіх выступленняў. Улічваючы палітычную пазіцыю і шкодніцкую дзейнасць кулацтва, а таксама факт суцэльнай калектывізацыі, была распрацавана новая палітыка ў адносінах да заможнай часткі сялянства. Гэта была палітыка ліквідацыі кулацтва як класа на аснове суцэльнай калектывізацыі… сэнс гэтай палітыкі… перавыхаванне іх шляхам далучэння да прадукцыйнай працы» (с. 78). Такім чынам, усё акцыі пратэсту (акрамя «масавага забойства сваёй жывёлы») аднесены да кулацкіх выступленняў!

Нагадаю, палітыка «ліквідацыі кулацтва як класа» – гэта не толькі «перавыхаванне іх шляхам далучэння да прадукцыйнай працы», але і расстрэл усіх, аднесеных да першай катэгорыі. Ды і само перавыхаванне, як мы добра ведаем, адбывалася на спецпасяленнях ва ўмовах неспрыяльных для выжывання, у Гулагу. А вось пра «скарачэнне пагалоўя» сялянства (у адрозненні ад скарачэння пагалоўя жывёлы) аўтар не піша. Хоць і сціпла адзначае, што мелі месца асобныя перагібы (с. 79).

Натуральна, пра голад у СССР у цэлым і БССР у прыватнасці няма ні слова.

---

в конце 1929 г., был создан механизм перераспределения средств на нужды индустриализации. Однако такой стремительный индустриальный рывок в рекордно короткие сроки был достигнут дорогой ценой – в основном за счет упадка сельского хозяйства и легкой промышленности, крайне низкого уровня жизни подавляющего большинства советских граждан» (*Космач Г. А.* Всемирная история Новейшего времени… – С. 91–93).

Выснова падручніка па тэме гучыць так: нельга ацэньваць калектывізацыю негатыўна (с. 79), яна «дазволіла стабілізаваць становішча ў аграрным сектары эканомікі, павысіць прадукцыйнасць працы, павялічыць вытворчасць збожжа, ільновалакна, бульбы, малака і іншай прадукцыі пры змяншэнні колькасці занятых у сельскай гаспадарцы» (с. 80). Больш за тое, «калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў СССР і БССР адлюстроўвала тэндэнцыі сусветнага развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці» (стварэнне буйных сельскагаспадарчых каапературываў) (с. 80)[6]. У глабальнай перспектыве можна было б задумацца, паспрачацца, але не ў раздзеле пра 1930-я гады!

Сярод пытанняў да параграфа: «Назавіце памылкі, якія былі дапушчаны пры правядзенні калектывізацыі». Адказ, відавочна, павінен будавацца так: курс правільны, але пры рэалізацыі… у сілу абставін … асобныя памылкі і г. д.

У параграфе 15 «Грамадска-палітычнае жыццё ў канцы 1920–1930-х гг.» абстаяльна распісана сістэма органаў кіравання, а пасля адзначана, што «рэальная палітычная ўлада канцэнтравался ў партыйных органах». Узнікае пытанне – і шмат было гэтых органаў? І што гэта такое? І дзеля чаго была распісана ўся структура органаў кіравання вышэй, калі яны нічым рэальна не кіравалі?

Адзначана, што мелі месца «адміністрацыйна-дырэктыўная метады кіравання, што абмяжоўвала ініцыятыву і прадпрымальнасць кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўзмацняла бюракратызм дзяржаўных структур» (с. 83) – нават не ведаю, як пракаментаваць гэты сказ… Атрымліваецца, ключавой характарыстыкай грамадска-палітычнага жыцця 1930-х гадоў было «ўзмацненне бюракратызму дзяржаўных структур»…

У дадзеным параграфе маецца асобы падраздзел «Палітычныя рэпрэсіі» (толькі падраздзел!), які пачынаецца так: «Курс на будаўніцтва сацыялістычнага грамадства пахаваў надзеі на рэстаўрацыю капіталізму. У 1920-я гады ў савецкім грамадстве абвастрыліся супярэчнасці па пытаннях аб кірунках грамадска-палітычнага развіцця краіны і шляхах пабудовы сацыялізму ў СССР. У вельмі жорсткай форме разгарнулася барацьба супраць праціўнікаў палітычнага курсу Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. У гістарыяграфіі гэтая барацьба вядома пад назвай палітычныя рэпрэсіі». Такім чынам, атрымліваецца: палітычныя рэпрэсіі – гэта жорстая барацьба супраць

[6] Параўнаем з падручнікам па Сусветнай гісторыі: «Продовольственное обеспечение процесса индустриализации не могло быть достигнуто на основе мелкого кустарного сельскохозяйственного производства «вольных» крестьян, преследующих исключительно свои интересы. Его могло обеспечить только послушное и контролируемое государством крестьянство. Принимая решение о сплошной коллективизации крестьян, советское партийное руководство стремилось также к укреплению своей власти путем уничтожения прослойки зарождавшихся сельских капиталистов (кулаков) и вообще рыночных отношений на селе. Объединение всех крестьян в колхозы и совхозы было не планомерным и добровольным, а немедленным и принудительным. Семьи зажиточных крестьян и даже середняков раскулачивались и выселялись в восточные и северные районы страны. От этой политики пострадали миллионы людей. Сократилось поголовье скота, начался массовый уход сельского населения в города, где требовалась рабочая сила. Оставшиеся в деревне 35 млн колхозников вынуждены были обеспечивать те же показатели сельскохозяйственного производства, которых ранее достигали 55 млн крестьян-единоличников. Таким образом, индустриальный скачок был осуществлен во многом за счет крестьян, полностью зависимых от государства. Именно в этом заключался основной исторический итог коллективизации». (*Космач Г. А.* Всемирная история Новейшего времени… – С. 94).

праціўнікаў палітычнага курсу Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. Дазволім сабе ўсумніцца ў правільнасці дадзенага вызначэння ў прынцыпе, да таго ж, падчас рэабілітацыі ахвяр сталінскіх рэпрэсій было выпрацавана зусім іншае вызначэннеі пад яго патрапілі нават тыя, каго аўтар у савецкім духу кляйміць як кулакоў.

Названа, што было рэпрэсавана 826 беларускіх нацыянал-дэмакратаў, узгадваецца зноў Саюз Вызвалення Беларусі (без тлумачэння, што гэта), ёсць пра парушэнне законнасці, даносы, здзекі і катаванні (адзін абзац с. 84–85). А далей «У выніку пацярпела шмат нявінных людзей – партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў, дзеячоў навукі, літаратуры і мастацтва, духавенства, працаўнікоў» [каго/чаго? хто гэта? – кам. *І. Р.*]. З сэрэдзіны 1950-да сярэдзіны 1990-х у Беларусі было рэабілітавана больш за 160 тыс. грамадзян, якія пацярпелі ад палітычных рэпрэсій [згодна з вышэйпрыведзеным вызначэненнем, усе яны, трэба меркаваць, былі «праціўнікамі палітычнага курсу Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы» – кам. *І. Р.*] (с. 85).

Тут цікавы момант, маштаб рэпрэсій не паказаны, не названы нават прыблізныя лічбы рэпрэсаваных (паводле У. Адамушкі гэта прыкладна 600 тыс.[7]), нечакана ўказана толькі колькасць рэабілітаваных (160 тыс.). Што гэта: спроба за меншымі лічбамі схаваць большыя? Дарэчы, крыху вышэй, пішацца пра адмену картак і ні разу не ўзгадваецца пра прычыны і час іх увядзення. Што гэта, свядомая канцэнтрацыя ўвагі толькі на пазітыве: адмена картак, рэабілітацыя і стваральная праца!

І далей: «Разам з тым дзесяткі мільёнаў ахвяр палітычных рэпрэсій у СССР, пра якія расказваецца ў публікацыях апошніх дзесяцігоддзяў, не што іншае, як міф, запушчаны ў грамадскую свядомасць для дыскрэдытацыі сацыялістычнай сістэмы» (с. 85). А крыху вышэй было аб тым, што «Пытанне чаму адбываліся рэпрэсіі, іх сапраўдныя прычыны ў гістарыяграфіі асвятляюцца з рознай ступенню аргументаванасці. Гісторыкі маюць розныя меркаванні па гэтым пытанні (гл. дадатковы матэрыял)» (с. 84).

Вельмі ўдалы ход! Школьны падручнік сёння не з'яўляецца адзінай крыніцай інфармацыі, а тэму сталінскіх рэпрэсій ад сённяшняга дня не аддаляе столькі стагоддзяў, як, напрыклад, сярэднявечнае паляванне на ведзьм. Наадварот, яна пастаянна актуалізуецца рознымі СМІ. Дыдактыка заключаецца ў тым, каб падрыхтаваць вучня да сустрэчы з іншай праўдай. І робіцца гэта вельмі крэатыўна!

Усе гісторыкі падручнікам згодна са сваімі трактоўкамі пычын рэпрэсій падзяляюцца на групы: 1) тыя, хто лічыць іх прычынай вызваленне партыйнага і дзяржаўнага апарату ад сапраўды недастойных чыноўнікаў, падаўлення мясцовага сепаратызму і забеспячэнне безумоўнай улады цэнтру; 2) «Другая група гісторыкаў, у тым ліку замежных, пісала аб тым, што Сталін напярэдадні Другой сусветнай вайны жорстка расправіўся з «пятай калонай» (чужаземнай агентурай, якая дзейнічала на тэрыторыі СССР) і гэтым самым умацаваў бяспеку ўласнай дзяржавы. Ініцыятыва ў ажыццяўленні рэпрэсій ішла «знізу» ад мясцовых партыйных і савецкіх кіраўнікоў…»; 3) тыя, хто лічыць, што рэпрэсіі мелі эканамічную аснову (выкарыстанне працы зняволеных); 4) гісторыкі, якія тлумачаць рэпрэсіі нецярпімасцю дзяржаўных і партыйных структур да іншадумства, перакладваннем уласных памылак на плечы «ворагаў» і «шкоднікаў»; 5) «нямала гісторыкаў… пішуць пра насілле бальшавікоў як «павівальную бабаку

[7] *Адамушка У.* Рэпрэсіі палітычныя / У. Адамушка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Минск: БелЭн, 2001. – Т. 6. – С. 175.

любой рэвалюцыі» і як вынік класавай барацьбы» [чаму насілле бальшавікоў – павівальная бабка ЛЮБОЙ рэвалюцыі таксама не зразумела – кам. *І. Р.*].

Пакінем у баку штучнасць і ўмоўнасць такога падзелу гісторыкаў. Тут важна іншае, такім чынам, вучань падрыхтаваны да таго, што ёсць больш радыкальныя падаходы да праблемы рэпрэсій, але нельга ім верыць, бо ў падручніку (якому вучань мусіць давяраць) дадзена іншая трактоўка.

Сашлемся на Х. Арэнд, якая пісала, што калі нехта не ў стане зрабіць так, каб з яго маной пагадзіліся, не настойвае, што яго сцвярджэнне – ісціна ў апошняй інстанцыі, але «делает вид, что это его «мнение», на которое у него, дескать, есть конституционное право… размывание границы, отделяющей истину факта от мнения, – одна из многих форм, какие может принять ложь»[8].

І калі вярнуцца да праблемы рэпрэсій. Нельга разрываць культуру і рэпрэсіі, ці эканоміку і рэпрэсіі і г.д., нельга пісаць пра поспехі індустрыялізацыі і маўчаць пра ГУЛаг, пісаць пра новую савецкую літаратуру і маўчаць аб тым, колькі і якіх кніг было знішчана фізічна, што такое самацэнзура і г.д.

У пераліку ахвяр, зноў жа, партыйныя кадры, дзеячы мастацтва, зусім не адзначана, што найбольшую колькасць рэпрэсаваных склалі «маленькія людзі» і, найперш, сяляне. Няма ніводнага слова аб масавых аперацыях, якія склалі «вертыкаль Вялікага тэрору»[9] («Аб аперацыі па рэпрэсаванні былых кулакоў, крымінальнікаў і іншых антысавецкіх элементаў» ад 30 чэрвеня 1937 г., нацыянальныя аперацыі НКУС), паводле якіх толькі з ліпеня 1937 па лістапад 1938 гг. у БССР было арыштавана 54 845 чалавек, з іх больш за 27 391 было расстраляна[10].

Па дадзеных аперацыях з Масквы спускаліся ліміты на арышт і растрэл. Паказ на прыкладзе канкрэтных архіўных дакументаў, як гэтыя ліміты ўстанаўліваліся, чаму і як яныбылі перавышаны на месцах ў тры-пяць разоў; што станавілася падставай для абвінавачвання чалавека ў шпіянажы, ці антысавецкай змове – вось, што сфарміруе ў вучня дакладнае ўяўленне, аб тым, што такое рэпрэсіі, што такое сталінізм, таталітарызм. А пошукі прыведзеных у дакументах прозвішчаў «шпіёнаў» і «ворагаў» у картатэцы рэпрэсаваных і рэабілітаваных « Мемарыяла» (можна выкарыстоўваць і кнігі «Памяць») дазволіць яшчэ раз паглядзець на дадзеную трагедыю, але праз лёсы канкрэтных «маленькіх» людзей.

Ілюстраванне рэпрэсій лёсамі толькі «вялікіх» людзей стварае ілюзію, што, па-першае, рэпрэсіі тычыліся не ўсіх, што таталітарны рэжым – гэта тое, што мела адносіны толькі да тых, хто недзе там «наверсе». Але дыктатура існавала не толькі дзякуючы тым, хто наверсе, з якімі тыя, што ўнізе не мелі нічога агульнага, ёй спрялі ўсе слаі і структуры грамадства. А з іншага боку, у «падначаленых» заўсёды застаецца крыху аўтаноміі, невялікая магчымасць дзейнічаць самастойна, хоць гэта можа і не праяўляцца адкрыта. Паставіць пытанне так, гэта значыць закрануць і злачынны саўдзел так званых «маленькіх людзей» у справах дыктатуры, не даць ім застацца

8 *Арендт Х.* Между прошлым и будущим. Восемь упражнений в политической мысли / Х. Арендт. – Минск: Изд-во института Гайдара, 2014. – С. 368–369.

9 *Юнге М.* Вертикаль большого террора. История операции по приказу НКВД № 00447 / М. Юнге, Г. Бордюгов, Р. Биннер. – Минск: Новый Хронограф, АИРО – XXI век, 2008.

10 Реабилитация: как это было. Документы Президиума ЦК КПСС и другие материалы: в 3 т. – Москва: МФД, 2003. – Т. 2. Февраль 1956 – начало 80-х годов. – С. 319.

толькі ў ролі ахвяраў рэжыму[11]. Добрым прыкладам тут будзе праца з матэрыяламі даносаў, альбо паказаннямі арыштаваных у 1938–1939 гг. супрацоўнікаў НКУС. Безумоўна, неабходна гаварыць і аб маніпуляванні грамадскай думкай, аб вялікай агітацыйна-прапагандыскай працы, аб тым, што некаторыя верылі ў існаванне разгалінаванага шпіянажу, аб тым, што людзей падвяргалі страшэнным пыткам, што ў такіх умовах чалавек не мог не агаварыць сябе, ці, нават, вялікую колькасць людзей, часам зусім незнаёмых.

«Традыцыйна» матэрыял у школьных падручніках, падручніках ВНУ структурыруецца па параграфах наступным чынам: грамадска-палітычнае жыццё (а тут адзначаецца, напрыклад, абвяшчэнне БССР, палітыка беларусізацыі і г. д.), затым эканамічнае развіццё (напрыклад, поспехі індустрыялізацыі), потым могуць ісці рэпрэсіі, а затым развіццё культуры. Такім чынам, як бы мы ні напісалі гэтую частку / параграф, папярэднімі і наступнымі – апісваючы дасягненні і поспехі ў справе індустрыялізацыі ці развіцці савецкай культуры – мы зводзім раздзел аб рэпрэсіях да ўзроўню прыватнага выпадку, эпізоду, накшталт, «АЛЕ! Разам з тым, былі і асобныя адмоўныя бакі... » (як гэта, напрыклад, адзначаецца пра калектывізацыю – і гэта сорам!). Каб сфарміраваць больш-менш адэкватнае ўяўленне пра феномен сталінізму, трэба памяняць саму структуру падачы УСЯГО матэрыялу па дадзеным перыядзе. Рэпрэсіі – гэта тое, што зрабіла і эканоміку і культуру і інш. такімі, якімі яны былі (!), гэта тое, што рабіла іх менавіта такімі, якія яны былі не толькі ў той перыяд, але і пасля яго і, нават, у некаторай ступені зараз ёсць!

Як бы мы ні распісвалі жахі таталітарызму (нават у будучых падручніках, цяперашні – не ў лік), колькі б мільёнаў-мільярдаў нявінна забітых мы не называлі, але пакуль будзе захоўвацца такі «традыцыйны» падыход да структурыравання матэрыялу, мы не зможам наблізіцца да ўсведамлення праблемы рэпрэсій, сутнасці таталітарызму.

У падручніку павінен быць матэрыял аб сутнасці сталінізма, таталітарызма і далей, як развіваецца і культура, і навука, і эканоміка, і «грамадска-палітычнае жыццё» у яго ўмовах.

Але сёння і сама таталітарная мадэль вывучэння савецкага грамадства з'яўляецца ў пэўнай ступені ўжо састарэлай. Сёння гісторыкаў цікавіць, найперш, адказ на пытанне адносна ўзаемасувязі паміж грамадствам і доўгачасовасцю існавання дыктатуры (у дадзеным выпадку камуністычнай). Выйсцем бачыцца даследаванне не толькі гісторыі палітычных інстытутаў і структур, не толькі дзеянняў палітычных функцыянераў і іх непасрэдных праціўнікаў, як гэта рабілі т.зв. «таталітарысты», але і не менш важную частку павінен скласці матэрыял, які будзе паказваць: чаму гэта стала магчыма; як усё больш шырокія колы насельніцтва стваралі не толькі базу для функцыянавання таталітарнага рэжыму, але самі станавіліся часткай гэтага механізму. Неабходна тут паказаць, што варыятыўнасць паводзін «маленькага чалавека» абмежаваная, што нярэдка гэта выглядала так – «хто не з намі, той супраць нас», але і, што не менш важна, сістэма жыццязабеспячэння ў 1930-я гады была пабудавана так, што толькі інтэграцыя ў савецкі праект дазвалася разлічваць на кавалак хлеба.

Для вывучэння ўзаемаадносін улады і грамадства, верагодна, карысным з метадалагічнага пункту можа стаць паняцце стратэгій (штодзённых стратэгій) і

[11] Повседневная жизнь при социализме. Немецкие и российские подходы. – Минск: Политическая энциклопедия, 2015. – С. 260.

выкарыстанне іх у якасці пэўнага метадалагічнага фрэйму (кансенсус, маніпуліраванне, адаптацыя, пасіўны і актыўны супраціў). Абавязкова павінен быць і матэрыял аб тым, якія месцы/пытанні прымушалі пераходзіць ад згодніцтва або пасіўнага ўспрымання рэжыму (нягледзячы на ўзгаданы вышэй кавалак хлеба) да супраціву і, нават, узброенай барацьбы супраць яго[12].

Менавіта другая складовая частка, на мойпогляд, дазваляе зрабіць падручнік неверагодна цікавым. Гэта другі мой тэзіс – падручнік гісторыі павінен быць цікавым!

Пры выкарастанні прапанаванай мной схемы з’яўляецца месца для самастойнай працы з крыніцамі, эга-дакументамі, якія заўсёды і ва ўсіх выклікаюць значна большую цікавасць, чым афіцыйныя дакументы. (Пакуль прыведзеныя ў падручніку дакументы вельмі афіцыйныя і вельмі малацікавыя: цяжка ўявіць сабе дзіця, якое добраахвотна чытае самую хлуслівую ў свеце Канстытуцыю 1936 года, якая, натуральна, у падручніку прыводзіцца ў іншым кантэксце).

Трэці мой тэзіс. У век «усезнаючага гугла» і даступнасці вялікай колькасці супярэчачых адна адной крыніц, задачай школьнага курса павінна быць фарміраванне навыкаў крытычнага мыслення. Прасцей (элегантней) за ўсё паказаць адносную праўду будзе на прыкладзе аналіза дакументаў. Паказаць, што гісторыкі не з’яўляюцца носьбітамі нейкай сакральнай веды аб мінулым. Няма аб’ектыўнай гістарычнай праўды, ёсць аб’ектыўныя факты (якія ўтрымліваюцца, напраклад, у архіўных дакументах), на падставе якіх гісторыкі ствараюць сваю інтэпрэтацыю падзей. Але сам гістарычны дакумент празмерна утылітарны. Найперш неабходна паглядзець: хто для чаго / каго яго ствараў, што аўтар павінен быў сказаць, аб чым павінен быў прамаўчаць, чаму выкарыстана такая тэрміналогія (напрыклад, «ворагі», «кулакі», «царкоўнікі»), што на падставе дадзенага дакумента мы можам вывучаць, а для чаго нам патрэбны нейкія іншыя віды крыніц, і, у такім выпадку, якія? Дакумент заўсёды нам нешта паведамляе, але ён заўсёды аб нечым умоўчвае. Няма такіх рэчаў, як «сапраўды аб’ектыўныя крыніцы» па-за межамі часу і месца, без чалавечай перадузятасці.

Аналіз першакрыніц, тэкстаў ці візуальнага шэрагу будзе не толькі паказваць вучням кухню гісторыка (як апошнія інтэрпрэтуюць сведчанні і канструююць гісторыю), але дасць магчымасць ацаніць розныя – і часта супярэчлівыя – інтэрпрэтацыі ключавых момантаў у мінулым. Калі мы навучым вучняў працаваць з першакрыніцамі, апрацоўваць іх і, галоўнае, ужывацца ў іх, вучні стануць крытычнымі мыслярамі, тэкст будзе для іх не толькі крыніцай інфармацыі, але і падставай для рэфлексіі. Пры чым любы тэкст. І што не менш важна, творчыя стратэгіі навучання ўзбагачаюць і ажыўляюць успрыяцце вучнямі мінулага, дазваляюць адкрыць для сябе свет, які адрозніваецца ад іх сучаснага.

---

[12] Аналіз некаторых канцэпцый вывучэння савецкага грамадства гл., напрыклад: Ірына Раманава. «Вынаходжанне» штодзённасці: як і што мы даследуем // Беларускі гістарычны агляд, 2017. – Т. 24. – С. 175–190.

**Iryna Romanova. Representation of the Bolshevik terror in school courses**

The paper touches upon the issue of the teaching history scheme in modern textbooks in Belarus, as combination of soviet scheme with rewriting the «old» topics and a small amount of new ones. This article consists of two parts. The first part describes the interpretation of 1930-s in a textbook for 10 classes (Ya. K. Novyk, «Istoriia bilorusiv», 1917–1945, «Vuch, Dapam, 10 klas», Minsk: «Narodnaasveta», 2012. 182 p.). The second part outlines the main author's ideas, and can be considered as an alternative textbook. It has been found out that it is necessary to change the textbook concept, not only the structure of material submission; we have to refuse the totalitarian model of studying Soviet society. In the era of Google and a lot of conflicting sources, the school course has a new task – to develop critical thinking skills. How to solve these problems by involving certain topics and materials in school courses, is shown.

*Keywords:* Belarus, school textbooks, national history, teaching material, new concepts.